ПАГАДНЕННЕ
ПАМІЖ УРАДАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І УРАДАМ КАРАЛЕЎСТВА ДАНІЯ
АБ РАЗВІЦЦІ ЭКАНАМІЧНАГА, ПРАМЫСЛОВАГА І ТЭХНІЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА
*)

______________________________
*) Уступіла ў сілу 7 лістапада 1994 г.

Урад Рэспублікі Беларусь і Урад Каралеўства Данія, якія ў далейшым называюцца "Дагаворныя Бакі",

жадаючы зрабіць новы ўклад у пашырэнне і інтэнсіфікацыю іх узаемаадносін на аснове раўнапраўя і ўзаемнай выгады,

жадаючы ў поўным аб'ёме выкарыстаць новыя магчымасці для далейшага ўмацавання іх супрацоўніцтва,

прызнаючы свае адпаведныя міжнародныя абавязацельствы ва ўзаемным гандлі,

падкрэсліваючы сваё жаданне забяспечыць непарыўнасць беларуска-дацкага супрацоўніцтва,

ДАМОВІЛІСЯ АБ НІЖЭЙПАДАДЗЕНЫМ:

Артыкул 1

Дагаворныя Бакі будуць імкнуцца развіваць і заахвочваць эканамічнае, прамысловае і тэхнічнае супрацоўніцтва паміж зацікаўленымі ўстановамі, арганізацыямі і прадпрыемствамі ў абедзвюх краінах. Гэта супрацоўніцтва будзе развівацца ў розных сферах эканамічнага жыцця, а таксама ў галіне прыкладной навукі і тэхнікі ў наступных напрамках дзейнасці:

а) супрацоўніцтва па праектах, якія выклікаюць сумесную зацікаўленасць, уключаючы інвестыцыі, дамоўленасці па ліцэнзіях і "ноу-хау" паміж беларускімі і дацкімі прадпрыемствамі і ўстановамі ў абедзвюх краінах і на рынках трэціх краін,

б) даследаванні і візіты з мэтай ажыццяўлення сумесных праектаў,

в) правядзенне курсаў і канферэнцый для спецыялістаў,

г) абмен спецыялістамі і практыкантамі,

д) абмен тэхнічнай дакументацыяй і інфармацыяй,

е) іншыя ўзаемавыгадныя формы супрацоўніцтва.

Артыкул 2

Дагаворныя Бакі актыўна супрацоўнічаюць у вызначэнні праектаў, якія з'яўляюцца асабліва важнымі для развіцця рыначнай эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь. Пры ажыццяўленні такіх праектаў належыць улічваць, акрамя іншых аспектаў і па ўзаемнай згодзе, вопыт дацкіх грамадскіх устаноў і прадпрыемстваў.

Дагаворныя Бакі будуць імкнуцца вызначаць праекты, якія маглі б быць фінансаваны ў рамках існуючых і будучых двухбаковых і шматбаковых праграм дапамогі.

Артыкул 3

Улічваючы структуру эканомік абедзвюх краін, могуць быць знойдзены асабліва перспектыўныя сферы эканамічнага супрацоўніцтва ў галінах прамысловай вытворчасці, сельскай гаспадаркі, перапрацоўкі харчовых прадуктаў, лясной гаспадаркі, рыбаводства, энергетыкі, інфраструктуры, транспарта і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, камунікацый, інфарматыкі, аховы здароўя, будаўніцтва, кансалтынгу, турызму, развіцця дзяржаўнага сектара, фінансавага сектара, прафесійнай падрыхтоўкі кадраў і аховы навакольнага асяроддзя.

Дагаворныя Бакі могуць вызначаць іншыя сферы супрацоўніцтва, якія выклікаюць узаемную цікавасць.

Артыкул 4

Дагаворныя Бакі могуць заключаць дадатковыя пагадненні, якія яны палічаць неабходнымі і пажаданымі для далейшага развіцця супрацоўніцтва.

Артыкул 5

Для рэалізацыі гэтага Пагаднення ствараецца Сумесная Беларуска-Дацкая камісія, у склад якой увойдуць прадстаўнікі адпаведных урадавых органаў, а таксама асноўных гандлёвых, прамысловых, сельскагаспадарчых, кансалтынгавых і фінансавых арганізацый абедзвюх краін.

У рамках сваіх магчымасцей Сумесная камісія:

аналізуе эканамічнае і дзелавое асяроддзе ў абедзвюх краінах;

разглядае прапановы, якія прадстаўлены любым з Дагаворных Бакоў;

вызначае і ўдакладняе патэнцыяльныя напрамкі доўгатэрміновага эканамічнага, прамысловага тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Каралеўствам Данія;

садзейнічае стварэнню спрыяльных умоў для ўмацавання і пашырэння такога супрацоўніцтва;

заахвочвае ўдзел адпаведных прадпрыемстваў і арганізацый у сумеснай эканамічнай дзейнасці;

імкнецца здымаць магчымыя перашкоды, што могуць узнікнуць пры ажыццяўленні гэтага Пагаднення.

Артыкул 6

Сумесная камісія можа ствараць пастаянныя або часовыя рабочыя групы экспертаў для разгляду канкрэтных пытанняў.

Сумесная Камісія збіраецца па ўзаемнай згодзе па чарзе ў Рэспубліцы Беларусь і ў Каралеўстве Данія.

Па просьбе любога з Дагаворных Бакоў для абмеркавання канкрэтных пытанняў могуць праводзіцца сустрэчы Сустаршынь Сумеснай камісіі.

Кожны з Дагаворных Бакоў у час прыёму прадстаўнікоў другога боку абавязуецца садзейнічаць ім у выкананні іх абавязкаў.

Артыкул 7

Дагаворныя Бакі пацвярджаюць, што садзейнічанне ажыццяўленню, а таксама ўзаемная ахова інвестыцый на адпаведных тэрыторыях іх дзяржаў з'яўляецца важнай перадумовай паспяховага эканамічнага супрацоўніцтва.

Артыкул 8

Гэта Пагадненне ўступае ў силу з дня падпісання і застаецца ў сіле на неабмежаваны тэрмін.

Любы з Дагаворных Бакоў можа спыніць дзеянне гэтага Пагаднення па сканчэнні каляндарнага года пры ўмове атрымання папярэдне за 6 месяцаў пісьмовага паведамлення адным з Дагаворных Бакоў.

Паведамленне аб спыненні дзеяння не ўплывае на выкананне кантрактаў і пагадненняў, падпісаных на падставе палажэнняў гэтага Пагаднення.

З даты падпісання гэта Пагадненне спыняе, у тым, што датычыцца адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Каралеўствам Данія, дзеянне наступных Пагадненняў:

Пагадненне паміж Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Каралеўствам Данія аб эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве ад 17 ліпеня 1970 года;

Пагадненне паміж Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Каралеўствам Данія аб развіцці эканамічнага, прамысловага, навуковага і тэхнічнага супрацоўніцтва да 28 жніўня 1975 года.

У сведчанне чаго прадстаўнікі, належным чынам упаўнаважаныя для гэтага іх адпаведнымі ўрадамі, падпісалі гэта Пагадненне.

Здзейснена ў Мінску 7 лістапада 1994 года, у двух аўтэнтычных экзэмплярах, кожны на беларускай, дацкай і англійскай мовах, пры гэтым тэксты на трох мовах маюць аднолькавую сілу. У выпадку ўзнікнення разыходжання ў тлумачэнні гэтых тэкстаў перавага будзе надавацца тэксту на англійскай мове.

За Урад Рэспублікі Беларусь

За Урад Каралеўства Данія